## Квест «Помнікі Быхаўскага раёна»

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў пачуцця павагі да гераічнага мінулага нашага народа.

**Ход гульні**

**I. Арганізацыйны момант**

Вядучы знаёміць удзельнікаў з правіламі гульні.

**II. Асноўны этап**

Удзельнікі, карыстаючыся QR-кодам, знаёмяцца з прапапанаванымі заданнямі, даюць адказы на пастаўленыя пытанні.

**Заданні**

1. Назавіце помнікі, якія знаходзяцца ў горадзе Быхаве.

Адказ: 1, 2, 3, 4, 6.

2. Назавіце помнікі, якія знаходзяцца ў Быхаўскім раёне.

Адказ: 5, 7, 8, 9, 10.

3. Пад якой лічбай знаходзіцца помнік, які ўстаноўлены ў гонар Ф. Смалячкова. Што вам вядома пра яго подзвіг?

Адказ: 7.

**Феадосій Арцем'евіч Смалячкоў** нарадзіўся 12 ліпеня 1923 года ў вёсцы Падгор'е Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1940 годзе ён паехаў вучыцца ў Ленінград у школу ФЗУ. Вучыўся на муляра і адначасова ў снайперскай школе пры АСААВІЯХІМе. Засвоіў тэорыю стральбы.

На другі дзень вайны Смалячкоў быў у ваенкамаце і прасіўся добраахвотнікам на фронт, але яму яшчэ не было 18 гадоў і яго не ўзялі. Тады ён уступіў у атрад народнага апалчэння Ленінграда. Яго залічылі ў супрацьтанкавую роту 13-й стралковай дывізіі. 19 кастрычніка 1941 года Феадосій адкрыў асабісты баявы рахунак, які пасля рэгулярна «папаўняў». А неўзабаве стаў навучаць снайперскай справе таварышаў. Яго пачын – памножыць шэрагі снайпераў – падхапілі ва ўсіх частках і падраздзяленнях фронту. Імя Смалячкова было вядома ўсім і на фронце, і ў блакадным горадзе. Ён стаў ініцыятарам і натхняльнікам спаборніцтва снайпераў.

4. Сярод змешчаных помнікаў назавіце тыя, якія прысвечаны ахвярам генацыду. Што вам вядома пра гэтыя падзеі?

Адказ: помнік ахвярам генацыду ў Быхаве (Ганькаў роў), помнік ахвярам генацыду ў вёсцы Вараніно.

5. Плошча Герояў. Чаму мае такую назву? Пра якіх герояў вядзецца размова?

Адказ: плошча Герояў размешчана ў горадзе Быхаве на вуліцы Грышына. Урачыста адкрыта ў 1966 годзе ў дзень святкавання 25-й гадавіны 57-ай марской ракетаноснай Чырванасцяжнай Смаленскай авіяцыйнай дывізіі.

Плошча мае форму прамавугольніка ў 452 квадратныя метры, па перыметры якога (па трох яго баках) на адлегласці 3 м адзін ад аднаго ўстаноўлены бюсты 30 воінаў-авіятараў Чырванасцяжнага Смаленскага авіяцыйнага злучэння, удастоеных звання Героя Савецкага Саюза.

6. Вышыня 150,9. Якой падзеі прысвечана? Як выглядае помнік?

Адказ: мемарыял воінскай славы «Лудчыцкая вышыня» адкрыты ў чэрвені 1984 года, напярэдадні святкавання 40-ой гадавіны вызвалення Быхаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Размешчаны ля дарогі паміж вёскай Тайманава і аграгарадком Лудчыцы, недалёка ад пасёлка Янава. Мемарыял уяўляе сабой скульптурна-архітэктурную кампазіцыю. Над земляным курганам дамінуе манумент – сімвалічная фігура гусляра, які праслаўляе подзвіг воінаў-герояў. Ля падножжа кургана – увагнутая сцяна-стэла з барэльефамі шасці герояў Савецкага Саюза.

7. Што вы ведаеце пра абаронцаў Лудчыцкай вышыні? Назавіце іх прозвішчы. У сканвордзе знайдзіце прозвішчы герояў Лудчыцкай вышыні. Падрыхтуйце інфармацыю пра герояў.

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| В | Ш | К | Щ | Е | С | Х | Й | Й | Я | Ш | З | Ч | Щ | Ф | Щ | З | Ц |
| С | Ц | Я | У | Ч | П | Ь | К | Ё | Ю | В | Ш | Ь | Ф | Г | П | А | Щ |
| Ь | М | Ю | О | Я | Х | А | Ы | Ш | Ы | У | Й | Э | К | Ё | Э | Ы | Д |
| Ч | Т | Т | О | К | Д | З | Х | М | Р | Р | Т | П | Й | А | Й | Э | К |
| Ч | Д | Й | Г | Я | С | Г | У | Д | Р | В | У | З | Ф | Э | Х | Я | Ш |
| С | У | Н | Д | У | Т | К | А | Л | І | І | С | К | А | Л | І | Е | Ў |
| Т | Щ | Т | Ф | Э | Ф | В | У | Ъ | М | Ц | К | Ъ | О | Ш | Н | Х | Ъ |
| П | Ё | Т | Р | В | І | Н | І | Ч | Э | Н | К | А | М | И | К | Ы | Ё |
| Я | С | А | Ч | О | Ц | Э | Й | Ф | Т | Ц | Щ | Ъ | Ч | С | С | О | Ю |
| П | Г | Ы | Я | Х | Л | З | Ш | Т | Х | Э | Б | Ц | К | У | Р | Ф | П |
| Ъ | П | И | Б | Ь | Х | С | Т | Л | Р | Ф | Ф | Ф | Ы | Э | Ь | М | Ъ |
| Б | Ч | Л | Н | Ф | В | Ш | Х | Е | Ц | У | К | Ь | П | Ы | Х | Ф | Е |
| Ц | З | Н | Й | Ы | Д | О | О | У | У | Е | И | С | Л | Ч | В | П | У |
| У | Л | А | Д | З | І | М | І | Р | М | А | Р | Т | Ы | Н | А | Ў | Ц |
| Г | А | Л | А | К | Т | Ы | Ё | Н | Р | А | З | М | А | Д | З | Е | Ы |
| Э | І | В | А | Н | Б | А | Р | Ы | С | Е | В | І | Ч | Ж | В | З | Ъ |
| У | К | Г | У | Л | Я | М | Я | К | У | Б | А | Ў | Я | Ь | Ё | А | Ы |
| Ъ | Ё | Й | Е | П | Х | Я | М | Ч | У | Ё | Ё | Д | Р | Н | Т | Ж | Ж |

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| С | У | Н | Д | У | Т | К | А | Л | І | І | С | К | А | Л | І | Е | Ў |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| П | Ё | Т | Р | В | І | Н | І | Ч | Э | Н | К | А | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |
| У | Л | А | Д | З | І | М | І | Р | М | А | Р | Т | Ы | Н | А | Ў | . |
| Г | А | Л | А | К | Т | Ы | Ё | Н | Р | А | З | М | А | Д | З | Е | . |
| . | І | В | А | Н | Б | А | Р | Ы | С | Е | В | І | Ч | . | . | . | . |
| . | . | Г | У | Л | Я | М | Я | К | У | Б | А | Ў | . | . | . | . | . |
| . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . | . |

8. Боўкінская блакада, якой камандаваў Герой Савецкага Саюза С. В. Грышын, стала цяжкім выпрабаваннем. Якія памятныя мясціны сёння нагадваюць нам пра тыя падзеі?

Адказ: на заходняй ускраіне вёскі Дабужа Быхаўскага раёна 9 мая 1966 года, у дзень святкавання гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, урачыста быў адкрыты Курган Неўміручасці як сімвал гераізму, які быў праяўлены ў кастрычніку 1943

года падчас Боўкінскай сямнаццацідзённай блакады партызанамі асаблівага рэйдавага партызанскага злучэння «Трынаццаць». Боўкінская блакада, якой камандаваў Герой Савецкага Саюза С. В. Грышын, стала цяжкім выпрабаваннем. У блакадзе апынуліся і некаторыя падраздзяленні 15-га партызанскага палка, 17-й брыгады і атрада «Перамога». Гітлераўцы накіравалі супраць 5 тысяч партызан, якія знаходзіліся ў міжрэччы Дняпра і Проні, і 20 тысяч мірных жыхароў, якіх ахоўвалі партызаны, больш за 25 тысяч карнікаў, бамбардзіроўшчыкі і танкі.

9. Усяго пахавана 2498 абаронцаў Айчыны (вядомы – 2446). Пра які помнік ідзе размова? Дзе ён размешчаны?

Адказ: Брацкая магіла размешчана ў цэнтры в. Ухлясць. Сярод пахаваных – воіны 108-й, 110-й, 238-й, 324-й, 362-й, 413-й стралковых дывізій і іншых падраздзяленняў, якія загінулі восенню і зімой 1943 года і зімой-вясной 1944 года ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі сельсавета. Акрамя таго, пахаваны партызаны і падпольшчыкі разнастайных злучэнняў, якія загінулі на тэрыторыі Быхаўскага раёна ў 1942–1944 гадах. Усяго пахавана 2498 абаронцаў Айчыны (вядомы – 2446).

**III. Заключны этап**

Пасля выканання задання вучні разважаюць над тым, як трагічныя падзеі адлюстраваны ў дадзеных скульптурных кампазіцыях.

Прапануецца воблака слоў «Сапраўдны патрыёт»: неабходна знайсці словы, якія называюць якасці, уласцівыя сапраўднаму грамадзяніну і патрыёту сваёй краіны.

